**Кобрынская цэнтральная раённая бібліятэка**
**Аддзел бібліятэчнага маркетынгу**
**Хроніка**
**культурнага жыцця бібліятэк г. Кобрына і раёна за верасень 2018 г.**

## Мерапрыемствы ў рамках раённага рэкламнага тыдня “Бібліятэка ў пошуках ўласнага аблічча”

У бібліятэках ДУК прйшоў раённы рэкламны тыдзень “Бібліятэка ў пошуках ўласнага аблічча”, у рамках якога шэраг бібліятэк ДУК правялі Дні самакіравання “Я - сёння бібліятэкар”, “Библиотекарь – значит креативный”, “Чытач за бібліятэчнай кафедрай”, “Дублёр-шоу”.

**12 верасня**

Госцем Дня прававой культуры “С правовой информацией на “Ты” стала натарыус натарыяльнай канторы Кобрынскага раёна Брэсцкай натарыяльнай акругі Н. Н. Філіпук. Навучэнцы політэхнічнага каледжа г. Кобрына здзейснілі экскурс у ПЦПІ цэнтральнай раённай бібліятэкі “Проводник в мир правовой информации”, прагледзелі відэапрэзентацыю “За правовыми знаниями – в библиотеку”, задалі пытанні натарыусу, паўдзельнічалі ў віктарыне “По букве закона”, а таксама пазнаёміліся з даведачна-прававой сістэмай “ЭТАЛОН-WIN” і самастойна паспрабавалі знайсці нарматыўна-прававыя дакументы.

ЦРБ, 79 чал.

**12 верасня**

У Дзень адчыненых дзвярэй "Неразлучныя сябры - мама, тата, кніга, я!" бацькі і дзеці ўспаміналі прыказкі і прымаўкі пра кнігу, гулялі ў розныя літаратурныя гульні, адказвалі на пытанні віктарыны, дэманстравалі свае выступленні аб карысці кніг і чытання. Бібліятэкары расказалі аб правілах карыстання бібліятэкай і правільным абыходжаннем з кнігамі, падрыхтавалі памятку бацькам “Сямейнае чытанне - у задавальненне”.

Гарадзецкі філіял, 18 чал.

**14 верасня**

Напярэдадні Дня бібліятэк прайшоў Дзень прэзентацыйнай рэкламы “Невозможное возможно в День библиотек”. Са словамі віншавання да прысутных звярнуліся дэпутат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сабранія Рэспублікі Беларусь Дземідовіч В. Н. і начальнік аддзела культуры Жук Н. В. Дырэктар ДУК правяла ўзнагароджанне юбіляраў сістэмы і пераможцаў раённага конкурсу дзіцячага чытання “Каникулы в библиотеке”. Работнікі публічных бібліятэк ДУК падзяліліся інавацыйнымі напрацоўкамі ў кірмашы цікавых ідэй. Музычны нумар вакальнай групы цэнтральнай бібліятэкі стаў прыемным падарункам да прафесійнага свята. Адбыліся заняткі ў школе пачатковага бібліятэкара.

ЦРБ, 68 чел.

**20 верасня**

Бібліятэка сумесна з Цэнтрам культуры і вольнага часу правяла свята вёскі “Залесье собирает друзей”, прысвечанае 455-годдзю вёскі Залессе. Падрыхтаваны краязнаўчая кніжная выстава “Край, где ты появился на свет”, выстава народнай творчасці “Рукотворная радуга мастеров земли Залесской”, выстава кампазіцый з прыроднага матэрыялу “Осенние фантазии”. Бібліятэкар правяла ўшанаванне актыўных карыстальнікаў бібліятэкі.

Залеская ПБ, 200 чал.

## Іншыя мерапрыемствы

**1 верасня**

У інфармацыйна-сэрвісным цэнтры для навучэнцаў СШ №1 і СШ № 3 г. Кобрына прайшоў традыцыйны Дзень ведаў “Мне выпала шчасце тут нарадзіцца”. Супрацоўнікі бібліятэкі паказалі відэафільм “Город древний, город молодой”; відэапрэзентацыю гісторыка-турыстычных маршрутаў “Ганарымся спадчынай роднага краю”, прэзентацыю краязнаўчых выданняў цэнтральнай раённай бібліятэкі, прысвечаных Кобрыншчыне “Ведай і любі свой край”. Вучні чыталі вершы пра Кобрын, актыўна ўдзельнічалі у віктарыне, адказвалі на пытанні, падрыхтаваныя супрацоўнікамі бібліятэкі і атрымлівалі заслужаныя прызы.

ЦРБ, 213 чал.

**12 сентября**

У рамках прафілактыкі суіцыдальных паводзін сярод моладзі адбылася гадзіна шчырай размовы “Я выбираю жизнь!”. Навучэнцы Кобрынскага дзяржаўнага політэхнічнага каледжа праслухалі статыстыку смяротнасці ад суіцыду і расказалі, чым могуць дапамагчы людзі, якія знаходзяцца побач, у прадухіленні падобнай сітуацыі. Айцец Андрэй са Свята-Хрыстараждзественскай царквы правёў гутарку пра сэнс чалавечага жыцця, аб маральных каштоўнасцях, аб стаўленні царквы да суіцыду. Мерапрыемства суправаджалася паказам відэапрэзентацыі “Жизнь бесценна – помни это!”.

ЦРБ, 58 чал.

**24 верасня**

У рамках рэспубліканскага фестывалю “Креативный возраст” на базе аграсядзібы “Палескія традыцыі” прайшла прэзентацыя выставы-панарамы “Малая Родина - большая любовь”, падрыхтаваная бібліёграфамі цэнтральнай раённай бібліятэкі.

Аграсядзіба “Палескія традыцыі”, 92 чал.

**24 верасня**

У рамках праекта “Тэрыторыя інттэлекту” адбыўся турнір інтэлектуальнай гульні “Что? Где? Когда?”. Спаборнічалі 4 каманды эрудытаў г. Кобрына: “Роза ветров”, “L&G”, “Мицар”, “Сириус”. Гульня складалася з двух турніраў: “АБВГДейка” і “Экоразум”. У напружанай барацьбе першае месца заняла каманда “L&G”. Спонсары гульні падарылі прызы для каманд. Вядучы гульні - Кузьміч В.С.

ЦРБ, 32 чал.

**26 верасня**

На базе інфармацыйна-сэрвіснага центру прайшла літаратурная вечарына “Вечны голас магутнага слова”, прысвечаная 75-годдзю з дня нараджэння знакамітай беларускай паэткі і перакладчыцы, аўтара кніг і п'ес для дзяцей, заслужанай дзеячкі мастацтваў Беларусі Ніны Іосіфаўны Мацяш.

Супрацоўнікі бібліятэкі разам з вучнямі СШ №8 г. Кобрына прагарталі старонкі біяграфіі паэткі, пагаварылі аб незвычайным літаратурным таленце Ніны Мацяш, прачыталі любімыя творы аўтара. Мерапрыемства суправаджалася паказам відэапрэзентацыі “Пакінула нам запавет быць адданымі”.

ЦРБ, 51 чал.

**26 верасня**

Тыдзень міру ў бібліятэцы прайшоў пад дэвізам «Жить всегда в мире». Юныя карыстальнікі прынялі актыўны ўдзел у акцыі «Мир, который нужен нам», у конкурсе малюнка «Мир глазами детей», даведаліся шмат фактаў з гісторыі Міжнароднага дня міру. З цікавасцю пазнаёміліся з кніжнай выставай «Через книгу к миру и согласию».

ЦРБ, 42 чал.

**27 верасня**

Гасцямі інфармацыйна-пазнавальнай гадзіны па музеях літаратурных герояў “Где прописан персонаж?” сталі падапечныя дзённага знаходжання Кобрынскага тэрытарыяльнага цэнтра сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва.

Супрацоўнікі бібліятэкі расказалі прысутным пра такія музеі, як: музей-церам Снягуркі, музей Маленькага Прынца, музей герояў Астрыд Ліндгрэн, музей, прысвечаны Шэрлаку Холмсу, д'Артаньяну, Барону Мюнхгаўзену. Мерапрыемства суправаджалася паказам відэапрэзентацыі «Музеи литературных героев».

ЦРБ, 23 чал.

Выканаўца Міхейкіна-Белякова А. М.
Тэл. 2 36 81